А.Л.Карацееў,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# РОЛЯ ВЫТВОРЧАЙ І ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ Ў СТАНАЎЛЕННІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДУХАВОГА МАСТАЦТВА

Разгляд пытанняў арганізацыі вытворчай і педагагічнай практыкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы з'яўляецца заканамерным пры асэнсаванні падрыхтоўкі кадраў Беларусі. Па-першае, ён прадвызначае пошук аптымальнай мадэлі падрыхтоўкі спецыялістаў XXI ст. Па-другое, усебакова вывучае дасягненні ўстаноў культуры і мастацтва Беларусі, іншых краін. На гэтай падставе магчымае вызначэнне канкрэтных шляхоў удасканальвання прафесійнай адукацыі будучых спецыялістаў. Важную ролю ў гэтым адыгрывае праверка ўзроўню ведаў і ўменняў студэнтаў у час самастойнага выканання індывідуальных заданняў на базах вытворчай і педагагічнай практыкі.

У навучальных установах арганізацыі педагагічнай і вытворчай практыкі надаецца пэўная ўвага. Але часта адносіны да гэтых відаў праверкі прафесійнай прыгоднасці будучых спецыялістаў носяць фармальны характар. Часам ігнаруюцца тыя задачы і мэты, якія ў абавязковым парадку павінны быць выкананы для аб'ектыўнай атэстацыі навучэнцаў. Гэта адбываецца з-за недахопаў у распрацоўцы і складанні вучэбных і рабочых планаў, неапраўданых тэрмінаў правядзення гэтых практык (магілёўскае, гродзенскае вучылішчы культуры і мастацтваў), запаўнення вучэбных гадзін па практыцы заняткамі па інструментальным ансамблі (Мінскае музычнае вучылішча) і інш. У 1987 г. у Мінскім інстытуце культуры з мэтай вывучэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў была праведзена навукова-метадычная канферэнцыя. На адной з секцый яе абмяркоўваліся даклады па праблемах арганізацыі практыкі будучых кіраўнікоў аматарскіх духавых аркестраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Семантыка слова практыка (ад грэч. praktikos — дзейсны, актыўны) дазваляе дакладна вызначыць змест гэтай формы атэстацыі ўзроўню падрыхтоўкі будучых маладых спецыялістаў духавога мастацтва: 1) авалоданне навучэнцамі пэўным аб'ёмам неабходных музычна-тэарэтычных ведаў і выканальніцка-абавязковых навыкаў і ўменняў; 2) пераканаўчае іх прымяненне для канкрэтнага віду работы (навучанне студэнтаў у навучальных установах або ў аркестрах, ансамблях і распрацоўка для канкрэтнага навучэнца аптымальных сістэм самастойных заняткаў; работа з ансамблем або аркестрам — правядзенне рэпетыцыі, стварэнне аранжыровак і інш.). Семантыка слова praktikos дазваляе зразумець сэнс і яшчэ адной разнавіднасці практычных заняткаў з мэтай павышэння ўзроўню прафесійных ведаў — практыкуму. У Беларусі ў 1970 — 1990-х гадах праводзіліся рэспубліканскія семінары-практыкумы для кіраўнікоў духавых аркестраў. Матэрыялы спецыяльнага практыкуму для аркестра былі апрабаваны на кафедры духавой музыкі Беларускага універсітэта культуры.

Падрыхтоўка спецыялістаў у Беларускім універсітэце культуры мае сваю спецыфіку і характарызуецца пяццю аспектамі ў змястоўным аб'ёме прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў:

— мастацка-выканальніцкім (па відах мастацтваў);
— псіхолага-педагагічным (у сферы мастацкай творчасці);
— інтэлектуальна-эрудыцыйным (з улікам комплекснага характару набыцця ведаў студэнтамі на універсітэцкім узроўні);
— камунікатыўным;
— арганізацыйным.

У сувязі з гэтым усе віды практыкі — вучэбная, азнаямленчая, вытворчая, дыпломная, педагагічная — павінны разглядацца як пэўныя этапы ў кваліфікацыйным росце будучых спецыялістаў духавога мастацтва і іншых спецыяльнасцей. Не выпадкова вытворчую і педагагічную практыку сёння мы разглядаем разам. Ці правамерная дыферэнцыяцыя і

змястоўны падзел практык на вытворчую і педагагічную? Улічваючы дастатковы пералік педагагічных задач для выканання заданняў студэнтамі спецыялізацыі ў час вытворчай практыкі ў калектывах, нельга абысціся ў працэсе падрыхтоўкі кадраў без педагагічнай практыкі як асобнага віду атэстацыі кваліфікацыйнага ўзроўню выпускнікоў. Зусім відавочная ўзаемасувязь гэтых відаў практыкі, іх узаемаабумоўленасць і ў той жа час канкрэтнасць кожнай з іх. У час двухгадовай педагагічнай практыкі на IV і V курсах студэнты кафедры духавой музыкі Беларускага універсітэта культуры маюць магчымасць у базавых навучальных установах праверыць узровень уласных ведаў і ўменняў. Нельга абвергнуць значнасць псіхолага-педагагічных аспектаў работы кіраўніка аматарскага ансамблевага або аркестравага калектыву духавых інструментаў. І зусім рэальна студэнтам праверыць свае педагагічныя веды на базах вытворчай практыкі ў аматарскіх і вучэбных аркестравых і ансамблевых калектывах. Таму, зыходзячы з пэўнага віду практыкі, неабходна толькі канкрэтызаваць тыя ці іншыя задачы, якія дазволяць студэнтам фарміраваць узровень свайго педагагічнага майстэрства.

Разгледзім сутнасць вытворчай практыкі спецыялістаў духавога мастацтва на прыкладзе вышэйшага звяна падрыхтоўкі спецыялістаў — Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускага універсітэта культуры.

Традыцыйна ў БДАМ па разглядаемай спецыялізацыі ажыццяўляюць падрыхтоўку артыстаў аркестравых калектываў, канцэртных выканаўцаў, выкладчыкаў навучальных устаноў. Студэнты на працягу навучання асвойвалі сакрэты ігры на тым ці іншым духавым інструменце і ў адпаведнасці з узроўнем выканальніцкай падрыхтоўкі размяркоўваліся ў аркестравыя калектывы або рэалізоўвалі свой патэнцыял на педагагічнай рабоце. З другой паловы 1980-х да канца 1990-х гадоў на кафедры драўляных духавых інструментаў і кафедры медных духавых і ўдарных інструментаў у выглядзе своеасаблівай вытворчай практыкі была ўведзена атэстацыя па "канцэртна-выканальніцкай практыцы". Згодна з

цэнтралізаванымі заяўкамі ў БДАМ студэнты размяркоўваліся для выступленняў на розныя канцэртныя пляцоўкі, выступалі ў канцэртнай зале сваёй навучальнай установы, а па выніках і ступені актыўнасці іх атэстацыя завяршалася залікам. У канцы 1990-х гадоў з-за перагрузкі вучэбных планаў такая форма апрабацыі прафесійных выканальніцкіх навыкаў студэнтаў была адменена. Паралельна з вучэбным працэсам многія са студэнтаў вытрымлівалі конкурс у аркестравыя прафесійныя калектывы на вакантныя пасады і даказвалі сваю кваліфікацыйную грунтоўнасць. Калі кіраўніцтва калектыву такі выканаўца задавальняў, то на яго афармлялі запыт для размеркавання на работу пасля заканчэння поўнага курса навучання ў навучальнай установе. Такая форма спалучэння навучальнага працэсу з самастойнай творчай работай не новая.

Вывучэнне гісторыі музычнай культуры Беларусі, аналіз розных этапаў фарміравання і развіцця духавога мастацтва нашай краіны дазваляе пазнаёміцца з багатым вопытам апрабацыі прафесійных навыкаў выканаўцамі на духавых інструментах. На стадыі зараджэння духавога музіцыравання ў старажытны час існаваў сузіральна-пераймальны спосаб. Навучэнец назіраў за ігрой музыканта, вывучаў асаблівасці гукаўтварэння на тым або іншым духавым інструменце, спрабаваў узнаўляць нескладаныя меладычныя паслядоўнасці. Затым у трубачоў у ваенных дружынах XII — XIII стст., у скамарохаў XII — XVIII стст., у інструментальных саставах езуіцкіх "бурс музычных" з XVI ст., у інструментальных капэлах шляхты, магнатаў XVI — XVIII стст. атрымаў распаўсюджанне такі спосаб, які можна называць трэнажна-тэхналагічным. Згодна з ім навучэнец з мэтай развіцця выканальніцкага майстэрства пасля тлумачэння настаўніка трэніраваўся на розных практыкаваннях, гамападобных пасажах, фрагментах музычных твораў або аркестравых, ансамблевых партый. Увага надавалася шматразовым паўторам таго ці іншага музычнага матэрыялу з захаваннем назначанай настаўнікам тэхналогіі выканання. Паказальным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца спосаб, які паявіўся крыху пазней. Яго можна назваць дыдактыка-канструктыўным. Навучэнец, прайшоўшы асноўныя этапы і ў дастатковай ступені асвоіўшы абраны для сябе духавы інструмент, ужо мог перадаць свае веды пачынаючаму музыканту. Так, напрыклад, у аркестры Гомельскай музычнай школы пры Магілёўскай архікафедры ў першай палове XIX ст. вучням, якія паспяхова прайшлі курс навучання на духавым інструменце, дазвалялася займацца самастойнай педагагічнай практыкай — рэпетытарствам. Вывучэнне гістарычнага вопыту апрабацыі прафесійных навыкаў выканаўцаў на духавых інструментах дазваляе сцвярджаць, што прагрэсіўным з'яўляўся і рэпрадуктыўна-мастацкі спосаб. Ён уяўляў арганічнае спалучэнне працэсу навучання музыканта з яго творча-выканальніцкай практыкай у саставе прафесійнага ансамбля або аркестра духавых інструментаў. Менавіта такі падыход да навучання ў пачынаючых музыкантаў у Мінскім гарадскім аркестры ў другой палове XIX ст., у духавым аркестры Мінскага вольна-пажарнага таварыства ў самым пачатку XX ст. Гэты спосаб не страціў сваёй актуальнасці ў педагагічнай і вытворча-выканальніцкай практыцы сучасных выканаўцаў на духавых інструментах. У Беларускім універсітэце культуры склалася стройная сістэма ўсіх разнавіднасцей практыкі. Выконваючы заданні па ўсіх відах практыкі, студэнт атрымлівае такі аб'ём інфармацыі, якая істотна ўплывае на ўзровень спецыяльнай падрыхтоўкі ў плане асваення ўсяго блока прафілюючых дысцыплін спецыялізацыі. У гэтых адносінах непасрэдна вытворчая практыка выступае як прафілюючая вучэбна-педагагічная дамінанта. Перш за ўсё выпускаючая кафедра духавой музыкі Беларускага універсітэта культуры дае магчымасць будучаму спецыялісту максімальна пераканацца ў дастатковасці яго прафесійных ведаў і ўменняў. Тое, што ўпушчана студэнтамі ў працэсе засваення вучэбнага матэрыялу, хаатычна нaганяецца імі ў час праходжання вытворчай практыкі. Яна выступае як своеасаблівы іспыт на прафесійную сталасць будучага спецыяліста па ўсіх кваліфікацыйных параметрах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што да педагагічнай практыкі выканаўцаў на духавых інструментах у вышэйшых навучальных установах рэспублікі, то ёсць свае праблемы ў гэтым плане ў Беларускай акадэміі музыкі, ёсць яны і ў Беларускім універсітэце культуры. Ва універсітэце сутнасць педпрактыкі заключаецца ў фарміраванні адпаведных ведаў і развіцці педагагічных уменняў будучых работнікаў сферы мастацкай творчасці. На першапачатковым этапе гэтая практыка носіць сузіральна-пасіўны характар. На этапе атэстацыі студэнту неабходна кваліфікавана разабрацца з падборам мастацкага рэпертуару, каб яго на дастойным узроўні паказаць на адкрытым уроку камісіі. Рэзервы для паляпшэння становішча спраў ва універсітэце ёсць. Пакуль мы знаходзімся толькі на шляху пошукаў удасканалення гэтага віду практыкі і спадзяемся на дапамогу з боку кафедры педагогікі, паколькі цяпер на педагагічную кваліфікацыю будуць прэтэндаваць усе.

Такім чынам, і вытворчая, і педагагічная практыка садзейнічаюць максімальна апрабацыі прафесійных ведаў студэнтаў.

Між тым да арганізацыі гэтых практык існуюць і негатыўныя адносіны:

1) з боку выпускаючай кафедры з-за прымусова-вымушанага размеркавання гадзін для забеспячэння навучальнага працэсу;

2) з боку кіраўніцтва баз практык з-за "ўварвання" ў асабістыя планы педагагічнай і творчай работы спецыялістаў гэтых устаноў, іх мізэрнага матэрыяльнага стымулявання і інш.

Шляхамі стымулявання ведаў студэнтаў па практыках могуць быць:

1) удасканальванне сістэмы аплаты кіраўнікам на базах практык;

2) выпрацоўка адзіных падыходаў у развіцці педагагічнага майстэрства студэнтаў на ўсіх практыках;

3) уключэнне апісальнага і аналітычнага матэрыялу аб практыках у рэфераты, бакалаўрскія і магістэрскія работы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) аптымізацыя зместу курса "Музычная педагогіка", "Псіхалогія мастацкай творчасці", магчыма ўвядзенне курса "Музычная псіхалогія";

5) семінары па афармленні дакументацыі;

6) арганізацыя "творча-педагагічных лабараторый", "майстар-класаў".

**Л.Г.Кірухіна,**
**нам. дырэктара па навуковай рабоце**
**Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

## УСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ ЯК БАЗЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Адной з галоўных праблем культуры з'яўляецца забеспячэнне яе ўстаноў прафесійна падрыхтаванымі кадрамі. Вырашэнне гэтага пытання патрабуе ад дзяржавы пастаянных увагі і клопату.

Па дадзеных Міністэрства культуры, на канец 1999 г. у рэспубліцы маецца 35431 штатная пасада спецыялістаў і кіраўнікоў сферы культуры. Запоўнены з іх — 33794 месцы. Вакансій — 1637 (4,6%). Вышэйшую адукацыю маюць 11068 (31,2%) работнікаў, сярэднюю спецыяльную — 17213 (48,6%). Пенсійнага ўзросту дасягнулі 1910 чалавек (6%). Між тым назіраецца паляпшэнне якаснага складу спецыялістаў. Так, напрыклад, нягледзячы на скарачэнне клубных устаноў, колькасць спецыялістаў павялічылася з 8188 чалавек у 1990 г. да 9758 у 1999 г. Вырасла колькасць спецыялістаў з прафесійнай падрыхтоўкай — з 53,8% у 1990 г. да 59% у 1999 г.

Сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў краіне немагчымы без спецыялістаў новай генерацыі, якім трэба будзе вырашаць існуючыя праблемы, ствараць спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця культуры з улікам набытых ведаў, навы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ